**Івін І.**

# ТАКІ ЁН НАШ ГЕРОЙ ЦЫРУБІН!

Яго партрэт першы. На гарадской алеі Славы Герояў Савецкага Саюза – ураджэнцаў Клімаўшчыны. Два Дзмітрыі: адзін з Цітаўкі, другі з вёскі Барысавічы за выдатныя баявыя заслугі удастоены гэтага высокага звання ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Дзмітрый Пятровіч Жмуроўскі зараз доктар гістарычных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, ён ніколі не. Ўпусціць магчымасць, каб не наведаць родныя мясціны. Тут да нядаўняга часу жыла яго маці, тут жыве брат Васіль.

Дзмітрый Малахавіч Цырубін зараз на пенсіі і жыве ў горадзе Нікалаеве на Украіне. Але няма таго лета ці восені, каб ён таксама не завітаў у родную Цітаўку да сястры Анюты. Тут жыве яго брат,; а другі сёлета з Масквы таксама прыехаў з жонкай на пабыўку. І вось браты-ветэраны вайны і працы зноў сустрэліся. Толькі ні гадзўны. не сядзіць у гасцях без работы Дзмітрый Малахавіч. Як прыехаў, адразу пайшоў з сястрой на саўгасны палетак на бураковыя плантацыі і дапамог убраць і здаць саўгасу каля дзесяці тон карняплодаў.

– Пасля горада без прывычкі пабальваюць рукі, плечы, – гаворыць ён, – саўгасныя буракі ўрадзілі сёлета на славу, да пуда кожны важыць. Трэба кожны з іх яшчэ з зямлі выцягнуць, абчысціць ад зямлі, абрэзаць і на машыны падаць. Адным словам, на свежым, бадзёрым восеньскім паветры – выдатная зарадка.

На другім тыдні Дзмітрый Малахавіч быў ужо ў лесе. Работнікі лясніцтва дапамаглі нарыхтаваць дроў, а дырэкцыя саўгаса выдзеліла транспарт. І аж дзве цялежкі драўніны былі дастаўлены з Макеевіч у Цітаўку. Зараз трэба іх распілаваць, пакалоць дровы.

Ні навастрыць пілу, ні давесці да ладу тапарышча да сякеры вучыць героя не трэба. Усё вядома з дзіцячых гадоў, усяму бацька з маці навучылі своечасова. Але дравамі можна будзе заняцца ў двары і пазней, калі непагадзь пачнецца, а вось у такое спрыяльнае восеньскае надвор'е, якое стаяла сёлета да дваццатага кастрычніка, што ўвесь светлавы дзень на нёбе сонца, Дзмітрый Малахавіч зноў выкарыстаў удала, каб абнесці агарод сястры новай агароджай. Сам і колікі нарыхтаваў, і жэрдкі прынёс з кустоў, якія Цітаўку абступілі з ўсіх бакоў, а дубовыя слупкі яшчэ здаўна пад страхой зберагліся. Доўга будзе яшчэ радавацца працай брата сястра Анюта, і сўседзям прыемна, калі на вуліцы і каля дома кожнага зроблены парадак.

За апошні час у саўгасе зроблены нядрэнныя пад'язныя шляхі да буйных вёсак, фермаў. У месцах, дзе раней увязваліся трактары,

аўтамашыны, зараз пакладзены бетаніраваныя трубы, зроблена гравійнае пакрыццё дарог.

Толькі гэта на галоўных шляхах гаспадаркі. А вось у Цітаўцы ёсць мост, які зусім разваліўся. Больш дзесяці гадоў ён выклікае клопат у ветэрана. Кожны раз, як прыязджае ў вёску Дзмітрый Малахавіч, просіць аднавяскоўацаў выйсці на суботнік і адрамантаваць, і гэты мост, які доўга служыў людзям і яшчэ паслужыць і для пешаходаў, і для павозак, каб не шыбаваць пяць, а то і цэлых дзесяць кіламетраў наўкол у пошуку добрай дарогі, Пара, здаецца, і дырэкцыі саўгаса прыслухацца да гэтай просьбы жыхароў самай аддаленай і лясной вёскі Цітаўка, якая дала краіне Героя Савецкага Саюза. Не толькі выдзеліць лесаматэрыял для рамонту маста, прадаставіць сюды транспарт, наогул праявіць увагу да просьбы ветэрана.

Такі ён наш працавіты, заўсёды неспакойны Дзмітрый Малахавіч Цырубін! Наш герой!

**Івін, І. Такі ён наш герой Цырубін! / І. Івін // Новае жыццё (Клімавічы). — 1986. — 25 кастрычніка. — С. 2.**